**Крачкоўскі, А.** «Калі чую пра Афганістан – нямее сэрца…» / А. Крачкоўскі // Зара. — 2009. — 13 лют. — С. 4.

## «КАЛІ ЧУЮ ПРА АФГАНІСТАН – НЯМЕЕ СЭРЦА…»



У гэту хату ў вёсцы Луг Вярхоўскага сельсавета журналісцкія справы прыводзілі не раз, і кожны прыход даваўся няпроста, бо тут жыве Роза Данілаўна – маці загінуўшага пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане Сашы Сухвала, Нялёгкім быў для мяне асабіста і гэты візіт: як сустрэне гаспадыня журналіста, пра што ні гавары, абавязкова не мінеш гэтай няпростай тэмы. А яе ж кволае сардэчка і без гэтага ўжо дастаткова панервавалася, перабалела, паірвалася ад нясцерпнага, горкага болю...

Але Роза Данілаўна гасцінна запрасіла ў хату і ледзь прыкметная ўсмешка кранула яе твар;

– Прысаджвайцеся, што новага на белым свеце? – пачала гаворку з пытання гаспадыня. – Я ж радыё не слухаю, паколькі няма яго ў мяне ўжо даволі працяглы тэрмін – як сапсавалася, так і маўчыць. Так што навінаў раёна не ведаю. Па тэлевізару, на жаль, іх не перадаюць, А так хацелася б даведацца... Вакол хат шмат, а пагутарыць няма з кім – пустыя яны. Вось і сумуеш адна...

– Як, Данілаўна, зімуецца? – пераводжу гутарку ў зямную плоскасць.

– Ды нічога зімуецца. Дроў купіла два прычэпы за 400 тысяч. Сын з зяцем іх спарадкавалі. Тры печы ў хаце, таму хутка дроўцы разыходзяцца. Некаторыя праз дзень даводзіцца распальваць – эканомлю, – ахвотна дзеліцца сваім Роза Данілаўна.

Хоць і адна засталася ў пакоях 70-гадовая жанчына, але гаспадарку не закінула – кароўку трымае, курак. Зноў жа на ўласную пенсію сена назапасіла...

– Летась цяля здала ў калгас – той і зернем заплаціў, Цяпер ёсць што даць жывёле. Па вясне планую парасят купіць – не сядзець жа без справы ў вёсцы, – павольна вядзе свой аповяд Роза Данілаўна. – Ды і не прывыклі. Муж, Міхаіл Іванавіч, як быў жывы, таксама справу сабе на двары заўсёды знаходзіў. Рупіўся ўсюды: і калі механізатарам працаваў у калгасе імя Карла Маркса, і пасля, калі малако збіраў. Здаецца, на здароўе ніколі не наракаў, а вось смерць Сашы яго і падкасіла – памёр у 1993-м. 54 гадкі было толькі. Ды і я ў Вярхоўскай бальніцы медсястрой пачынала, потым да пенсіі зарплату ў калгасе людзям выдавала. Мы ўсе працавітыя па роду…

Шасцёра і дзетак было ў яе бацькоў – тры браты, столькі ж сясцёр. Роза Данілаўна – самая старэйшая з іх. Дзякуй Богу, усе жывыя ды і жывуць не так далёка адзін ад аднаго. Усе дастойна працавалі, дастойна і жыць працягваюць. – Такога ні я, ні бацька не чакалі – смерць Сашы настолькі знянацку навалілася на нас, што літаральна аглушыла, бы абухом, – вярнулася Роза Данілаўна да балючай тэмы, – Добрым, паслухмяным рос, паважалі сына і настаўнікі, і

аднавяскоўцы, Дапамагаў мне ва ўсім. Ваенную прафесію марыў набыць, у Ленінград паступаць ездзіў. Потым на токара ў Віцебску вывучыўся, працаваў у калгасе. За дзень у армію сабраўся. Дзе службу праходзіў, не пісаў, Паведамляў толькі, што ў яго ўсё добра, прасіў не хвалявацца, а тут на табе – загінуў 7 студзеня 1983 года... Ды так недарэчна... Хай бы ён жыў на радасць нам і сыну Ванечку. Ён ужо дарослы. Жаніўся, двойня нарадзілася. У Віцебску жыве, працуе на будоўлі. Да мяне наведваецца... Хоць у гэтым нейкая душэўная радасць і асалода ёсць для мяне, бабулі і прабабулі... Я для дзяцей ды ўнукаў толькі і жыву... Сын Сяргей у аўтапарку працуе, дачка Людміла – у Віцебску. Свае сем'і маюць, дзетак гадуюць, мяне не забываюць – шануюць, дапамагаюць... Так і жыву. Праўда, ноччу толькі доўга заснуць не магу: усё жыццё Сашына перабіраю ў памяці – і як маленькі быў, і як у школу бегаў, і як у армію адыходзіў, і як цынкавую труну прывезлі...

Змоўкла на нейкі момант субяседніца, сцішылася. А я моўчкі гляджу на партрэт Аляксандра Міхайлавіча, што вісіць на сцяне побач з абразамі. Балюча, моўчкі і ён паглядае на нас зверху: у салдацкай гімнасцёрцы і з капялюшам на галаве. Зусім яшчэ маладзенькі юнак, а ўжо дастойна прадстаўляў сваю малую радзімуі чужбіне, у далёкім Афганістане дзеля чаго, дзеля каго, за якія інтарэсы? Хай бы сваю Радзіму абараняў, нават цаной уласнага жыцця. А то ні за што і ні пра што склаў Саша сваю маладую галоўку... Добра што хоць спакой набыў на роднай зямлі... Быццам пачуўшы мае думкі, схамянулася Роза Данілаўна:

– Калі я чую слова Афганістан, у мяне нямее сэрца, Ніяк не маглі звыкнуцца...

Гора маці зразумець няцяжка. На тое ж яна і маці, каб яе маглі разумець не толькі дзеці, але і дарослыя... І не толькі па памятныя датах і падзеях, а пастаянна. Вось гэта і будзе сапраўднай павагай і пашанай перад вечнай жанчынай, імя якой – Маці!

**Анатоль Крачкоўскі**

*На здымку: Роза Данілаўна Сухвал*